**Маціеўскі, М.** Кветкі на граніце / М. Маціеўскі // Чырвоны прамень (Чашніцкі раён). — 1990. — 24 красавіка. — С. 2 — 3.

## КВЕТКІ НА ГРАНІЦЕ

Вячаслаў Краўцоў пражыў вельмі мала. Толькі дваццаць гадоў адпусціў яму лёс. Але цану жыццю ён зведаць паспеў – там, у Афганістане.

Рос Вячаслаў нічым асабліва не вызначаўся сярод сваіх равеснікаў. Гэтак жа, як і ўсе, любіў пагуляць у футбол, ірвануць раніцай з вудай на возера... У яго было шмат сяброў. Равеснікі цанілі ў ім дабрыню, сумленнасць і смеласць, якая праяўлялася з дзяцінства. Яны расказвалі мне аб гэтым. І я зараз, перачытваючы пісьмы Вячаслава з Афганістана родным і сябрам, разумею, як усе яны правы. Чулыя, уважлівыя радкі, клопат і цеплыня ў кожным слове. Іх мог пісаць толькі добры чалавек, якім ён і быў...

Пасля школы Вячаслаў закончыў Новалукомльскае СПТВ-83, працаваў у будаўнічым упраўленні ДРЭС. А потым – пазвалі на службу ў рады Савецкай арміі.

– Калі даведалася, што Слава мой трапіць у Афганістан, – гаворыць маці Вячаслава Любоў Мікалаеўна, – вельмі перажывала: там жа вайна, а які салдат з васемнаццацігадовага хлопца? Незадоўга да смерці прысніўся ён мне. Нібыта дадому вярнуўся. Хто ж тады ведаў, што і сапраўды вернецца мой сыночак, ды толькі... у труне. А я не веру...

– Вось тут усё, што засталося аб яго памяці, – ціха гаворыць яна і асцярожна, нібы баючыся штосьці разбіць, дастае ўсё пра Вячаслава. На стол кладуцца дакументы, ордэнская кніжка, узнагароды, пісьмы. Іх шмат. У кожным лісце можна знайсці такія словы: «Мама, у мяне ўсё выдатна. Не хвалюйцеся...».

Першае баявое хрышчэнне Вячаслаў разам з баявымі сябрамі атрымаў неўзабаве пасля прыбыцця ў Афганістан. Атакавалі невялікі кішлак, у якім гаспадарылі душманы. Бачна, ведаючы аб нашым наступленні, банда ўмацавалася на дарозе, якая вяла ў населены пункт. Варожы кулямёт не змаўкаў ні на мінуту. Давялося залегчы. Вячаслаў выбраў на распаленых каменях зручнае месца, з усёй сілай узяўся за аўтамат як быццам зліўся з ім. Ён не памятаў, колькі часу працягвалася гэта дуэль. Час раптам спыніўся. І толькі, калі душманскі кулямёт замаўчаў, камандзір падняў байцоў у атаку. Цяжкае дыханне бягучых сяброў, глухі топат салдацкіх ботаў, шуршанне камянёў, страляніна, частыя ўдары сэрца і труслівa бягучыя «духі» – вось ураджанні салдата ад першай баявой атакі.

Атака, бой, раненні... смерць. Як балюча горка пісаць пра гэта, а калі ўяўляеш падаючых на зямлю бязвусых хлопцаў. Чамусьці раптам прыпомнілася вершаваныя радкі пра іх, воінаў-афганцаў:

Вам маладзік свяціў
злачынна
У мораку чужых нябёс.
Як і ў байцоў вайны
Айчыннай
У вас такі ж нялёгкі лёс.
Хай ад малітваў і замоў

Хутчэй загойваецца рана
Не ўсім ад гор
Афганістана
Вярнуцца выпала дамоў...
Аж дзесяць год у сэрцы
з болем
Не толькі воляю сваёй
Ішлі на подзвіг ратным
полем
Вы на віду планеты ўсёй.

– Я не веру, што яго няма, – зноў і зноў паўтарае Любоў Мікалаеўна.

Сэрца маці… Яно адчувае кожны крок свайго сына ці дачкі на адлегласці. Прадчувае небяспеку і імкнецца адвесці яе. Але што зробіш, калі твой сын гэтак далёка, і дапамагчы ты можаш толькі пісьмамі: шчырымі і пяшчотнымі, але яны не могуць перапыніць варожую кулю.

– Каб яна згінула, вайна праклятая! – голас жанчыны зрываецца, пераходзячы на ціхі плач. А мой позірк затрымліваецца на дзвюх баявых узнагародах Вячаслава Краўцова: на ордэне Чырвонай Зоркі і медалі «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа». Ён быў мужным воінам, наш зямляк новалукамчанін Слава Краўцоў.

Шмат разоў хадзіў Слава на баявыя заданні. І ні разу не струсіў, не змаладушнічаў – паступаў так, як таго патрабавала абстаноўка. Толькі вось аднойчы не вярнуўся з няроўнага бою з ненавіснымі «духамі».

Вясной 1984 года ў Новалукомль прыйшло пісьмо ад тых, хто служыў побач з воінам-інтэрнацыяналістам Вячаславам Краўцовым. Вось радкі з яго: «Вячаслаў быў мужным воінам, да канца выканаўшым свой абавязак....

Саслужыўцы заўсёды бачылі ў ім надзейнага сябра і вернага таварыша, гатовага заўсёды, у любой абстаноўцы прыйсці на дапамогу. Вячаславу былі ўласцівыя высокія маральна-палітычныя якасці.

Загінуў 6 красавіка 1984 года. Пры выкананні баявога задання праявіў мужнасць і адвагу, але варожая куля абарвала яго жыццё».

На могілках, што размясціліся ў маўклівым сасонніку, непадалёк ад вёскі Старыя Лаўкі, адразу можна заўважыць магілу воіна-інтэрнацыяналіста. Па прыгожаму строгаму помніку, па жывых кветках на пастаменце. Шостага красавіка кожны раз прыходзяць сюды тыя, хто ведаў і любіў гэтага простага, мужнага хлопца.

СПЫНІСЯ, прахожы, спыніся. Схілі нізка галаву, памаўчы. Тут не трэба ніякіх слоў. Толькі сціскаецца сэрца, горкі камяк падкочваецца да горла... Ён жа быў такім маладым.

**Мікола МАЦІЕЎСКІ**